# Знайсці і не страціць

**Шмат гадоў дзе разам з вучнямі, а дзе і самастойна займаўся я вывучэннем гісторыі родных мясцін. І шмат было цікавых сустрэч з рознымі людзьмі...**

Падагульняючы, хацелася б самыя найлепшыя словы падзякі выказаць шэрагу мужчын, з якімі прыйшлося перагарнуць не адну старонку памяці. У далёкім Залессі такім аказаўся Міхаіл Антонавіч Хамюк, у Хвалявічах Аляксандр Іванавіч Хамюк. Колькі цікавага было запісана са слоў Васіля Сцяпанавіча Рупекі з Панасавіч і Аляксея Нікіфаравіча Шэшка з Осаўцаў. Фенамянальны апавядальнік Іван Міхайлавіч Меляшэвіч, не саступіць яму Васіль Антонавіч Салавей з Селаўшчыны і Уладзімір Міхайлавіч Аскерка з вёскі Чарнічнае.

Самыя прыемныя стасункі наладзіліся і з М.А. Цюшкевічам. Праехаўшы першы раз па вёсцы Варажбіты, проста магнітам пацягнула наведаць хату гэтага чалавека, пра якога ў мяне не было ніякай інфармацыі, ехалі наўздагад. Верылі, што пашанцуе, так і здарылася.

Мікалай Аляксандравіч ведаў жыццё людзей не толькі сваёй вёсачкі, а і ўсёй акругі. Ён мог распавесці не толькі ў паняцці прасторы, а і паглыбіцца ў далёкія часы. І памяць яго не падводзіла!

Фактычна наша з вучнямі сустрэча з М.А. Цюшкевічам была адзінай, таго кароткага матэрыялу аб гісторыі хутароў было дастаткова. Пасля мы размаўлялі толькі па тэлефоне. Кожны званок для яго быў як пачатак, як старт у мінулае, яму падабалася весці размову.

Апошні раз я набраў звыклы нумар у студзені 2011 года. Але гэта быў сумны званок, мне паведамілі, што менавіта ў гэтым месяцы, тыдзень таму, Мікалая Аляксандравіча не стала. Таму некалькі радкоў удзячнай памяці прысвячаю гэтаму добраму чалавеку.

М.А. Цюшкевіч быў вышэй сярэдняга росту, калісьці чарнявы, што не скрылі перажытыя гады. Кідаліся ў вочы моцныя, жылістыя рукі, што бываюць у многіх працаўнікоў зямлі, сельскіх гаспадароў. Голас крыху глухаваты, але моцны. Агульна складвалася ўражанне аб упэўнена стаячым чалавеку, стабільным у справах, учынках. Мікалай Аляксандравіч не падстройваўся, размаўляў на мясцовым дыялекце беларускай мовы, але не пазбягаў і літаратурнай. Выглядала гэта натуральна і проста, у адказ нараджалася прыязнасць і ўдзячнасць, глыбокая, чалавечая.

У час той адзінай сустрэчы зайшла мова аб хутары Каты, бо якраз вучні займаліся гісторыяй хутарской гаспадаркі ў Заходняй Беларусі. Асабіста мяне цікавілі падзеі, якія былі звязаны з ліквідацыяй яўрэйскай сям'і Кушаляў. Звесткі аб забойстве ў Катах былі атрыманы раней, але нічога больш дакладнага не знаходзілі. М.А. Цюшкевіч удакладніў, што Кушаль не прозвішча, а імя. А сапраўднае прозвішча загінуўшых ахвяр Фінкель.

Апавядальнік добра ведаў брата К. Фінкеля, які ў перадваенны час выкладаў у мясцовай школе. Атрымалі мы параду пагаварыць з жыхаркай Катоў, якая сябравала з дзецьмі загінуўшых, а цяпер жыве зусім побач, у Сашыцы.

Любоў Іосіфаўна Кот была падлеткам у гады вайны, яна распавяла дакладныя звесткі аб трагедыі, што ўдакладняліся ў сустрэчы з жыхарамі суседніх з Катамі вёсак.

Пабываць на хутары хацелася адразу, той вельмі снежнай зімой 2010 года. Але дабрацца да яго не ўдалося, хоць мы стаялі амаль побач, нас раздзяляла кіламетровая прастора, пакрытая тоўстым слоем снегу.

Хутар пустуе, на ім толькі адзываецца тэлефон людзей, якіх даўно тут няма. Чамусьці не адключылі...

Працягнуць справу мне дапамагла настаўніца з Броннай Гары Е.Б. Мшар, якая даследуе пытанні знішчэння яўрэяў у Бярозаўскім раёне.

У снежні 2011 года ў Сашыцу прыехалі два дактары гістарычных навук, каб запісаць успаміны Любові Іосіфаўны Тарасевіч (у дзявоцтве Кот) для міжнароднай супольнасці. Відэазапіс рабілі апаратар з Іерусаліма, былы наш зямляк па Савецкаму Саюзу Анатоль Кардаш і супрацоўнік Вашынгтонскага інстытута Халакоста Натан Бейрак. Натан жыве ў Ізраілі, вядзе шмат год даследаванні на постсавецкай прасторы аб ганеннях і забойствах яўрэяў у гады Другой сусветнай вайны. Такіх запісаў-успамінаў на тэрыторыі Латвіі, Эстоніі, Літвы і Украіны зроблена ўжо звыш 1500. Н. Бейрак, працягваючы працу Стывена Спілберга "Спіс Шындлера", ужо і ў Беларусі запісаў звыш 20 эпізодаў.

Некалькі слоў аб гібелі яўрэйскай сям'і ў Катах. Любоў Іосіфаўна Тарасевіч лічыць, што тутэйшыя яўрэі не хацелі падпарадкавацца паліцаям, якія прыехалі, каб вывезці тых у бярозаўскае гета. Таму людзей проста сагналі ўскрай Катоў да альховага гаю і пастралялі. Агульная колькасць загінуўшых склала дзесяць чалавек. Сам К. Фінкель, жонка Хася, дзве дачкі - Мідля і Фрыда, два сыны - Лейба і Цалка, жонка Цалкі Фрыда, родам з Ясевіч, два ўнукі - Моўша і Шэвах. Дзясятым стаў яўрэй з Мальча, які ў той дзень наведаў, як ён думаў, сваю будучую нявесту Фрыду Фінкель.

У завяршэнне. Тыя, хто займаецца вывучэннем гісторыі сваёй радзімы, вялікай і малой, павінны памятаць, што вялікая маса людзей з выдатнай памяццю і не меншай любоўю да сваіх каранёў і мясцін пакідае нас штодня. Не трэба адкладваць, каб пасля шкадаваць, што зноў не змаглі, спазніліся. І згубілі незваротна.

**Мікалай ПЕЙГАН,**

*в. Сялец.*